# УНІКАТЫ ПУСЛОЎСКІХ ПАЛАТАЎ

## Чым здзівіць часовая экспазіцыя Косаўскага палаца?

**Гэты архітэктурны арыстакрат цягам доўгіх часоў вабіў вытанчанасцю і незвычайнасцю. Яго непаўторныя аркападобныя, прадаўгаватыя вокны ў змярканні нагадваюць свечкі. Як агні мінулага, запаленыя сучаснасцю, яны прыцягваюць аматараў даўніны. Стромкія цэнтральныя вежы высяцца грацыёзна, быццам вартаўнікі стагоддзяў, чакаюць палёгкі і суцяшэння. Каменны прыгажун кліча да сябе. Але ўзняцца да яго няпроста: застыў на ўзвышэнні. Уздым да яго працяглы, няхуткі. Так і сам ён паўстае з руін: нялёгка. Сёння палац Пуслоўскіх глыбока ўздыхнуў з надзеяй. Часткова аднаўлены (рэстаўрацыя доўжыцца амаль дзесяць гадоў), ён прадстаўляе першую часовую экспазіцыю і вітае наведвальнікаў.**


Макет адрэстаўраванага Палаца Пуслоўскіх, прадстаўлены ў экспазіцыі.

### ПАД АХОВАЙ БЕЛАЙ ЗАЛЫ

З пяці залаў, адкрытых для наведвання, больш за ўсё экспанатаў у белай зале. Рэстаўрацыя палаца працягваецца, пакуль яшчэ няма ацяплення, таму прадстаўлены «некапрызныя» прадметы.

— Экспазіцыя створана ў прыстасаваных умовах, без неабходнай мікракліматычнай абстаноўкі, таму сёння тут паказаны экспанаты, якія не патрабуюць спецыяльных дадатковых умоў. Гэта аб'екты, якія былі знойдзены пры археалагічных раскопках, калі мы толькі рыхтаваліся да рэстаўрацыйных работ. Усе выстаўленыя ў вітрынах экспанаты маюць непасрэднае дачыненне да палаца, — пракаментаваў **Вячаслаў ГАРБУЗАЎ, начальнік упраўлення культуры і галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама.**

Сярод знаходак, знойдзеных падчас раскопак Косаўскага палаца, — лыжкі, відэльцы, іншыя сталовыя прыборы, шклянкі, кілішкі, адмысловы посуд, пярсцёнак, пенснэ (сяр. XIX — пач. XX стст.). Таксама прадстаўлены фрагменты чыгуннага ліцця, дзвярныя ручкі, фрагменты дэкаратыўнай лепкі ўнутранага ўбрання палаца (усё сяр. XIX ст.), часткі кераміці XVII—XIX стст., саліды Рэчы Паспалітай (другая палова XVII ст.), кавалерысцкія шпоры і фрагменты зброі (XVI—XVIII стст.). З асабліва каштоўных экспанатаў — аб'ёмны фрагмент паркавай скульптуры (галава адной з ацалелых пасля Першай сусветнай вайны статуй, якая калісьці ўпрыгожвала парк палаца; статую бачылі яшчэ ў 1925 годзе), знойдзеная на тэрыторыі палаца падчас правядзення земляных работ. Палац памятае польскі час, Першую, Другую сусветныя войны, таму цікава паглядзець знойдзеныя прадметы ваеннаслужачых, ваенны рыштунак.


Біблія (копія) з бібліятэкі Палаца Пуслоўскіх, выратаваная падчас пажару.

### СЛАВУТАЯ БІБЛІЯТЭКА І ЗАХАВАНАЯ БІБЛІЯ

Бібліятэка Вандаліна Пуслоўскага — найбуйнейшы прыватны збор кніг і рукапісаў у Беларусі ў другой палове XIX ст., які налічваў 10 000 адзінак захоўвання — была гонарам гаспадара і культурнай скарбніцай палаца.

Частка кніг належала яшчэ Войцеху Пуслоўскаму, бацьку Вандаліна (ён меў шырокія сувязі ў Пецярбургу, Вільні, Варшаве, яго прымаў імператар Аляксандр I; не раз гасцяваў у Войцеха нацыянальны паэт Польшчы Юльян Нямцэвіч, былы ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі), аднак асноўны фонд сабраў Вандалін Пуслоўскі, малодшы сын Войцеха.

Вандалін быў надзвычай рознабаковай асобай. Цікавіўся археалогіяй, фатаграфіяй, архітэктурай... Пастаянна ладзіў музычныя вечары і канцэрты, запрашаў славутых выканаўцаў. Залы і галерэі палаца з цягам часу напаўняліся ўражальным зборам карцін і прадметаў мастацтва. Хутка Вандалін Пуслоўскі стаў адным з найбуйнейшых калекцыянераў на Літве, прычым больш увагі ўдзяляў жывапісу і рэдкім кнігам. Калекцыя мела сапраўдныя рарытэты. У 1869 годзе Вандалін Пуслоўскі падарыў 29 тамоў старажытных рукапісаў Кракаўскай акадэміі. Гэта былі працы гісторыкаў і філосафаў XVII—XVIII стст., прычым большасць — аўтарскія арыгіналы. Сярод падоранага — помнік беларускай літаратуры «Запавет Івана Мялешкі» (з подпісам Іпацыя Пацея), унікальны сярэднявяковы рукапіс «Vaticinium Marchicurn» і іншыя рэдкасці. Лічыцца, што многія экзэмпляры Вандалін Пуслоўскі набываў непасрэдна ў выдаўцоў. Не абмінаў таксама распродажаў і аўкцыёнаў, дзе можна было купіць каштоўныя кнігі з чужых калекцый. У асабістую бібліятэку Пуслоўскі паступала перыёдыка, што выходзіла ў Вільні, Варшаве, Кракаве, Санкт-Пецярбургу...

На кнігах бібліятэкі прастаўляліся штампы: «Wand. Puslowski», «Z biblioteki Wandalina Puslowskiego». Па некаторых пазнаках можна было расшыфраваць цікавасць і кола зносін гаспадара. Так, захаваліся «косаўскія» выданні з пячаткамі і аўтографамі пісьменніка, дэпутата сейма і былога каралеўскага камергера Войцеха Нарбута, а таксама яго брата, брэсцкага каноніка Станіслава Нарбута. Частку сваіх прац Пуслоўскаму падарыў славуты археолаг і гісторык Яўстафій Тышкевіч, заснавальнік Віленскай археалагічнай камісіі і Музея старажытнасцяў у Вільні, калекцыянер, этнограф. Плацыд Янкоўскі, пісьменнік і паэт, доктар тэалогіі, прысвяціў уладальніку Косаўскага палаца свой твор «Некалькі ўніверсітэцкіх успамінаў». Эліза Ажэшка была сябрам сям'і Пуслоўскіх, гасцявала ў палацы і прысвяціла гаспадарам адзін са сваіх твораў — аповесць «Пампалінская», дзе адлюстравала складаныя адносіны Вандаліна Пуслоўскага з сынам Леонам.

Частку сваёй бібліятэкі Пуслоўскі перадаў дачцэ Марцэ, якая жыла ў Свіслачы. Потым, на рубяжы XIX—XX ст. ад маёмасці Пуслоўскіх у Беларусі застанецца толькі яе маёнтак. Там знаходзілася і бібліятэка, якую пасля, у 1927 годзе, Марта перадала ў Гродзенскі музей — сёння Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей.

Мастацкая галерэя, бібліятэка Палаца Пуслоўскіх былі разрабаваны падчас Першай сусветнай вайны, часткова разбураны сам палац. Пацярпеў ён і ў Другую сусветную, цудам падчас пажару ў 1944 годзе аднаму з мясцовых жыхароў удалося выратаваць Біблію з бібліятэкі Палаца Пуслоўскіх. Выданне з карціннымі літаграфіямі Г. Дарэ ў XIX ст. мела вялікі поспех і лічылася творам мастацтва. Сёння копія Бібліі прадстаўлена ў экспазіцыі палаца.

### ЧАРОЎНАЯ МУЗЫЧНАЯ СЦЯНА — МІФ?

У асноўных памяшканнях палаца была выдатная акустыка. У цэнтральнай частцы, расказваюць, знаходзілася незвычайная музычная сцяна. Калі дзяўчына ў пышнай сукенцы ўзнімалася па лесвіцы і выпадкова дакраналася да сцяны, ва ўсіх пакоях пачынала гучаць музыка. Дзіва? «У сцяну былі ўмацаваны гаснікі — гліняныя гаршчочкі, якія звычайна выкарыстоўваліся для паляпшэння акустыкі ў старажытных цэрквах. У гэтыя гаршчочкі былі насыпаны косткі жывёл. І калі хтосьці праходзіў і дакранаўся да сцяны, косткі пачыналі варушыцца. Такім чынам атрымліваўся гук», — расказала **Паліна САВУЦІНА, навуковы супрацоўнік Івацэвіцкага гісторыка-краязнаўчага музея.**

Палац быў не толькі раскошным звонку, але і зручным і камфортным унутры: працавала паветранае ацяпленне, падлога падагравалася ад паравых катлоў. Існавала вельмі прадуманая сістэма вентыляцыі. Па ўсім перыметры палаца было вялікае сутарэнне, дзе знаходзіліся яе элементы інжынернага абсталявання, гаспадарчыя памяшканні.




Фрагмент паркавай скульптуры — галава ацалелай статуі, якая ўпрыгожвала парк Палаца Пуслоўскіх. Здымак 1925 года.

Стэнды экспазіцыі вельмі інфарматыўныя, і нават самы патрабавальны наведвальнік задаволіцца новымі ведамі.

— Зрушылася нарэшце гэтая доўгачаканая рэстаўрацыя, — выказаўся **Юрый ЗЯЛЕВІЧ, дырэктар музея-сядзібы «Пружанскі палацык».** — Хай пакуль экспазіцыя часовая, але будзем мець надзею, што з'явіцца пастаянная, хаця экспанаты таго часу знайсці цяжка. Многае залежыць ад фінансавых сродкаў, экспанаты знойдуцца. Выдатна ўсё зроблена для часовай экспазіцыі. Адзіная заўвага, што няма інфармацыі на беларускай мове (ёсць руская, англійская). Шкада.

Косаўскі гігант марыць пра балі і ўрачыстасці, высокія прыёмы і новыя знаёмствы. Хочацца верыць, што ён будзе ў цэнтры ўвагі, будзе радаваць і прыносіць карысць.

**Наталля СВЯТЛОВА.**

## НАБЛІЖЭННЕ ДА ВЕЧНАСЦІ

**Памёр паэт Алесь КАСКО. Але застаецца народжанае ім святло слоў і вобразаў, сімвалаў і фарбаў. Такая ўжо доля сапраўднай паэзіі — хваляваць і абуджаць.**

Надзвычай сціплы чалавек, родам з легендарнага, вядомага ўсім этнографам Чудзіна, што на Ганцавіччыне (успомніце даследчыцкі лёс Аляксандра Сержпутоўскага і яго фальклорныя запісы), ён і жыў на Берасцейшчыне, і вучыўся тут, у Брэсце, і пайшоў з жыцця ў роднай сваёй старонцы.

Паэт Божай ласкі, ён пакінуў пасля сябе няшмат кніг. Але ўсе яны — і першы зборнік «Веска» ў калектыўнай кнізе «Нашчадкі», і наступныя «Скразная лінія», «Набліжэнне», «Час прысутнасці», «Сорак пяць», «Трохкроп'е», «Прыадхінуты небасхіл», «Межавыя знакі» — вызначаюцца высокай культурай верша, гранічнай шчырасцю, бязмежнасцю сімвалаў і вобразаў, якія вылучаюць кожны верш, кожную страфу. Паэт добра ведаў еўрапейскую, сусветную паэзію. Ажыццявіў сур'ёзныя захады да перакладчыцкай справы. Здолеў паэтаў іншых славянскіх народаў узяць у палон беларускай мовы. І зрабіў гэта шчыра, сардэчна, на высокім мастацкім узроўні.

Алесь Каско прыналежны да той кагорты сапраўдных паэтаў, у якіх быў і застанецца чытач. Максім Танк, Пімен Панчанка, Аляксей Пысін, Міхась Рудкоўскі, Яўгенія Янішчыц, Міхась Стральцоў... Вось тая гвардыя, якой ён роўны, з якой ён знітаваны ў чытацкіх уяўленнях. Пералік усіх, хто прыналежны да паэтычнага сузор'я, багаты і шматпланавы. Алесь Каско ў гэтым радзе мае сваё адмысловае месца. Чытанне яго вершаў — асаблівая асалода, размова з крыніцамі і лясамі, рэкамі і сінім небам, размова з Часам і Прастораі. «Дол спапялёны, і ў чэзлай траве / конік зялёны і той не жыве. / Неба пустое — без жаўрукоў, / жыта сухое — без васількоў...» Гэтыя радкі — з вершаў нядаўніх, з падборкі, якую надрукаваў колькі гадоў назад «Дзеяслоў». А пачатак быў з публікацыі верша «Пралескі» ў 1968 годзе ў ганцавіцкай раённай газеце. Нейкі час Алесь Каско працаваў і ў нашай «Звяздзе». Вызначыўшы сваім паэтычным веравызнаннем клопат «служыць Радзіме і красе», паэт рабіў гэта годна. А далей службу працягнуць яго вершы. Яны — бы тыя салдаты, быццам самая што ні ёсць зброя ў арсенале беларускага прыгожага пісьменства.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**